# ДАКУМЕНТЫ НЕ МАЎЧАЦЬ

## У Нацыянальным архіве прайшла І Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Партызанскі архіў»

**У форуме, прымеркаваным да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, узялі ўдзел вядучыя вучоныя і спецыялісты па гэтай тэме не толькі з нашай краіны, але і з Расіі і Казахстана, якія дыстанцыйна выйшлі на сувязь з аўдыторыяй. Абмеркавалі найважнейшыя пытанні, звязаныя з захаваннем гістарычнай памяці, аб'ектыўным адлюстраваннем падзей Вялікай Айчыннай вайны. Падчас канферэнцыі, што вельмі важна, прысутнічалі школьнікі, якім працягваць несці праўдзівую інфармацыю аб тым, што адбывалася на беларускай зямлі ў 1941—1944 гадах.**



### І захоўваюцца, і вывучаюцца

Вітаючы ўдзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі, **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Алег ВОІНАЎ** адзначыў, што сам час падштурхнуў да таго, што гісторыю трэба памятаць і шанаваць. «Паглыбляючыся ў архіўныя дакументы, а таксама знаходзячы новыя, пачынаеш усведамляць, што ёсць яшчэ што вывучаць і ёсць да чаго імкнуцца, — падкрэсліў ён. — І гэта добра, што мы не спыніліся, а працягваем вывучаць спадчыну, якая ў нас ёсць, нашу гісторыю, і расказваем аб гэтым непасрэдна маладому пакаленню».

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь — галоўны захавальнік архіўных дакументаў па гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі нашай краіны, у тым ліку па вызваленні беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дзясяткі тысяч архіўных спраў дазваляюць усебакова і аб'ектыўна вывучаць гісторыю ўсенароднага супраціўлення. І трэба сказаць, што партызанскія дакументы карыстаюцца попытам у насельніцтва.

«Сёння гэта адны з самых запатрабаваных дакументаў, — звярнуў увагу **намеснік дырэктара Нацыянальнага архіва Святаслаў КУЛІНОК**. — Калі мы прааналізуем работу чытальнай залы, убачым, што дакументы па гісторыі партызан карыстаюцца вялікай цікавасцю і ў нашых, і ў замежных даследчыкаў. Гэта звязана і з асаблівай роляй гісторыі Вялікай Айчыннай вайны *ў нашай гістарычнай навуцы*, і з расследаваннем крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа. А партызанскія дакументы з'яўляюцца багатым матэрыялам па расследаванні злачынстваў нацыстаў. Увогуле, архіўныя дакументы — аснова любога навуковага даследавання».

Пры гэтым варта заўважыць, што супрацоўнікі Нацыянальнага архіва не толькі ажыццяўляюць захоўванне каштоўных дакументаў, але і актыўна вывучаюць тэму партызанскага руху, запаўняюць белыя плямы гісторыі. Толькі за апошнія пяць гадоў архівістамі выдадзены 11 зборнікаў дакументаў, пяць альбомаў, чатыры навуковыя і навукова-папулярныя манаграфіі, два электронныя зборнікі дакументаў. Рэалізоўваюцца шматгадовыя *інтэрнэт-праекты*, апублікаваны сотні навуковых артыкулаў.

Па словах Святаслава Кулінка, тэма Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку партызанскай барацьбы, невычарпальная. «Вельмі шмат аспектаў, мноства тэм, якія недастаткова вывучаны, і архіўныя дакументы даюць магчымасць гэтыя прабелы запоўніць», — заўважыў ён.

Новае гучанне партызанская праблематыка атрымала пасля рассакрэчання ў пачатку 1990-х вялікага масіву архіўных дакументаў. «Зроблена сапраўды вельмі шмат, — адзначыў **намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі Павел ТРУБЧЫК**. — Выклікае павагу сумесны праект Выдавецкага дома «Беларусь сёгодня» і Нацыянальнага архіва «Партызаны Беларусі», дзе любы можа, фактычна не выходзячы з дому, знайсці дакументы аб сваяках, блізкіх, якія ўдзельнічалі ў партызанскім руху. Нацыянальная акадэмія навук рэалізоўвае праект «Летапіс Вялікай айчыннай вайны», выдадзены чатыры кнігі. Падрыхтавана пятая, якая будзе складацца выключна з дакументаў, яе большая частка прысвечана дзейнасці партызан на тэрыторыі Беларусі».



### «Гістарычная памяць — магутны рэсурс кансалідацыі»

**Дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Мікалай МЫСЛІВЕЦ** падзяліўся ўласнымі напрацоўкамі, якія датычацца захавання гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне ў Беларусі. «Тыя падзеі, якія адбываліся ў нашай краіне і не толькі на працягу апошніх гадоў, актуалізавалі цікавасць да вывучэння і мінулага нашай краіны, і гістарычнай памяці, — канстатаваў ён. — Захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне — гэта безумоўны прыярытэт той палітыкі, якую праводзіць сучасная беларуская дзяржава. Гістарычная памяць — вельмі магутны рэсурс кансалідацыі нашага грамадства».

Тэма Вялікай Айчыннай вайны займае асаблівае месца ў гістарычнай памяці жыхароў Беларусі. Аб гэтым сведчаць вынікі даследаванняў, якія праводзіць Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. «У жыхароў краіны высокая ступень цікавасці да нашай гісторыі, — удакладніў Мікалай Мыслівец. — Так, пры адказе на пытанне «Ці цікавіць вас гісторыя Вялікай Айчыннай вайны» больш як 90 % апытаных адказваюць сцвярджальна». Мы задавалі рэспандэнтам пытанне «Ці можаце вы з упэўненасцю сказаць: я ганаруся тым, што жыву ў краіне, якая разам з іншымі краінамі атрымала Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне?». У гэтым упэўнены 92 % усіх апытаных. Такая інфармацыя неабходная для таго, каб карэкціраваць адукацыйную палітыку, інфармацыйную палітыку, улічваць яе ў сваёй рабоце, бо дасягнуць поспеху, захаваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне можна толькі сумеснымі намаганнямі».

**Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь — галоўны захавальнік архіўных дакументаў па гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі нашай краіны, у тым ліку па вызваленні беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дзясяткі тысяч архіўных спраў дазваляюць усебакова і аб'ектыўна вывучаць гісторыю ўсенароднага супраціўлення. І трэба сказаць, што партызанскія дакументы карыстаюцца попытам у насельніцтва.**

Апошні тэзіс пацвярджае і даўняе ўзаемадзеянне Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь з расійскім фондам садзейнічання актуальным гістарычным даследаванням «Гістарычная памяць». Чарговае пагадненне аб супрацоўніцтве было падпісана на палях канферэнцыі. Акрамя таго, для наведвальнікаў і ўдзельнікаў форуму былі падрыхтаваны новая банерная выстава «Рэспубліка-партызанка», шэраг партызанскіх артэфактаў, выяўленых пошукавым атрадам імя В. Каржа. Таксама падчас канферэнцыі прэзентавалі новыя выданні Нацыянальнага архіва па гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, кінахроніку з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў.



«Архівы ператвараюцца ў паўнавартасныя навуковыя і культурна-асветніцкія цэнтры, — кажучы аб шматграннасці канферэнцыі, заўважыў Алег Воінаў. — Шматмільённы Нацыянальны архіўны фонд Рэспублікі Беларусь — гэта не толькі дакументальная скарбніца нашай краіны, але яшчэ і галоўная крыніца гістарычнай праўды».

### Артэфакты 80-гадовай даўнасці

Падчас навукова-практычнай канферэнцыі распавялі аб выніках работы са знойдзенымі падчас пошукавых работ дакументамі партызанскай брыгады імя У. І. Леніна Пінскага злучэння. Дакументы былі знойдзены ў чэрвені 2023 года каля населенага пункта Гоцк Салігорскага раёна. На працягу 80 гадоў яны знаходзіліся ў зямлі ў металічнай скрыні. Знайшлі артэфакты ў дрэнным стане, на іх рэстаўрацыю спатрэбілася нямала часу, аднак цяпер гэта ўнікальная магчымасць даведацца больш пра партызанскую брыгаду, якой камандаваў Васіль Васільеў. Брыгада была створана 4 красавіка 1943 года. На момант злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў 1944 годзе налічвала 1067 чалавек, што сведчыць аб паспяховасці яе баявой дзейнасці.

Па меркаванні **навуковага супрацоўніка Цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Валерыя НАДТАЧАЕВА**, дакументы былі закапаны ў зямлю для прадухілення іх магчымага захопу праціўнікам у ходзе правядзення адной з карных аперацый. Такая практыка, па яго словах, дыктавалася не толькі логікай узброенай барацьбы, але і спецыяльнымі ўказаннямі Беларускага штаба партызанскага руху.

Пасля азнаямлення з дакументамі адразу на месцы пошуку было прынята рашэнне аб транспарціроўцы і перадачы дакументаў у Цэнтральную лабараторыю забеспячэння *захаванасці дакументаў* Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь. «Дзякуючы прафесіяналізму супрацоўнікаў, добраму тэхнічнаму абсталяванню лабараторыі ўдалося вырашыць вельмі важную задачу па забеспячэнні фізічнай захаванасці гэтых дакументаў, — падкрэсліў Валерый Надтачаеў. — У верасні мінулага года дакументы былі перададзены ў Нацыянальны архіў, дзе далей з імі была працягнута работа».

Як расказаў Святаслаў Кулінок, праляжаўшы ў зямлі больш як 80 гадоў, многія дакументы аказаліся беззваротна страчанымі. «Больш чым палова выяўленых дакументаў — на жаль, гэта фрагменты, — канкрэтызаваў ён. — На многіх адсутнічае датаванне або нельга ўстанавіць аўтарства. Матэрыялы ёсць як арыгінальныя, так і копіі. Сустракаюцца машынапісныя і рукапісныя тэксты, якія ствараліся пёравай ручкай або алоўкам. У цяперашні момант дакументы захаваны і алічбаваны».

Што датычыцца зместу знойдзеных артэфактаў, як правіла, гэта матэрыялы справаводства: *арганізацыйна-распарадчыя*, планава-справаздачныя, даведачна-інфармацыйныя, судова-следчыя і дакументы кадравага характару. Яны адрозніваюцца па іерархіі стварэння: ротныя, атрадныя і брыгадныя дакументы. Апошняя дата, пазначаная на адным з дакументаў, — 29 верасня 1943 года. Спецыялісты мяркуюць, што або ў канцы верасня, або ў пачатку кастрычніка дакументы былі закапаны для таго, каб іх зберагчы.

Знойдзеныя праз 80 гадоў матэрыялы дазваляюць удакладніць і дапоўніць даныя аб баявой, разведвальнай і дыверсійнай дзейнасці партызанскіх атрадаў. І, самае галоўнае, дзякуючы гэтым дакументам удалося ўстанавіць імёны сямі партызан, якія дагэтуль не значыліся ў інтэрнэт-партале «Партызаны Беларусі».

На адзін навуковы форум стала больш і ў архіўнай галіне — плануецца, што Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Партызанскі архіў» стане штогадовай і будзе праходзіць не толькі ў Мінску, але і ў розных рэгіёнах Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**